# Указ

# Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

25 жніўня 2026 г. № 292 г.Мінск

**Аб заснаванні афіцыйных геральдычных сімвалаў Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі**

1. Унесці змяненні ва Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 18 снежня 2001 г. № 757 ”Об учреждении нагрудного знака Министерства жилищно-коммунального хозяйства ”Ганаровы работнік жыллёва-камунальнай гаспадаркі“ (дадатак).

2. Дадзены Указ уступае ў сілу пасля яго афіцыйнага апублікавання.

Прэзідэнт
Рэспублікі Беларусь А.Лукашэнка

АДМИНИСТРАЦИЯ ПРЕЗИДЕНТА РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ * 2 *
Для правовых актов

11

Дадатак
да Указа Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь
25.08.2026 № 292

ЗМЯНЕННІ,

якія ўносяцца ва Указ Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь ад 18 снежня
2001 г. № 757

Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 18 снежня 2001 г. № 757 ”Об учреждении нагрудного знака Министерства жилищно-коммунального хозяйства ”Ганаровы работнік жыллёва-камунальнай гаспадаркі“ выкласці ў новай рэдакцыі:

”Указ

Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

Аб афіцыйных геральдычных сімвалах Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі

У мэтах захавання і развіцця гістарычных традыцый Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі п а с т а н а ў л я ю:

1. Заснаваць:

эмблему Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі;

флаг Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі;

нагрудны знак Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі ”Ганаровы работнік жыллёва-камунальнай гаспадаркі“.

2. Зацвердзіць:

Палажэнне аб эмблеме Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі, яе апісанне і выяву (дадаюцца);

Палажэнне аб флагу Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі, яго апісанне і выяву (дадаюцца);

Палажэнне аб нагрудным знаку Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі ”Ганаровы работнік жыллёва-камунальнай гаспадаркі“, яго апісанне і выяву (дадаюцца).

3. Фінансаванне расходаў на выраб заснаваных дадзеным Указам афіцыйных геральдычных сімвалаў і пасведчанняў да нагруднага знака Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі ”Ганаровы работнік жыллёва-камунальнай гаспадаркі“ ажыццяўляць у межах сродкаў, прадугледжаных у рэспубліканскім бюджэце на ўтрыманне Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі.

ЗАЦВЕРДЖАНА

Указ Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь
18.12.2001 № 757
(у рэдакцыі Указа Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь
25.08.2026 № 292 )

ПАЛАЖЭННЕ

аб эмблеме Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі

1. Эмблема Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі (далей – эмблема) з'яўляецца атрыбутам і адметным знакам Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі.

2. Выява эмблемы размяшчаецца на флагу Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі, афіцыйным сайце Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі ў глабальнай камп'ютарнай сетцы Інтэрнэт, ганаровых граматах Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі, падзяках Міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі.

3. Выява эмблемы можа выкарыстоўвацца на друкаванай, рэкламнай, сувенірнай і іншай прадукцыі, якая вырабляецца для патрэб Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі, а таксама ў іншых выпадках, якія не супярэчаць заканадаўству.

4. Дапускаецца ўзнаўленне выявы эмблемы ў каляровым, чорна-белым і аб'ёмным варыянтах.

5. Выява эмблемы можа размяшчацца ў службовых кабінетах Міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі, яго намеснікаў, кіраўнікоў структурных падраздзяленняў Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі і іншых месцах, якія вызначаюцца Міністрам жыллёва-камунальнай гаспадаркі.

6. Пры адначасовым размяшчэнні Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь і эмблемы іх размяшчэнне вызначаецца ў адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь ад 5 ліпеня 2004 г. № 301-З ”О государственных символах Республики Беларусь“.

ЗАЦВЕРДЖАНА

Указ Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь
18.12.2001 № 757
(у рэдакцыі Указа Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь
25.08.2026 № 292 )

АПІСАННЕ

эмблемы Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі

Эмблема Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі (далей – эмблема) уяўляе сабой белы круг з аблямоўкай бронзавага колеру.

У цэнтры размешчаны лагатып ”ЖКХ“.

Унізе размешчаны аб’екты гарадской інфраструктуры, звязаныя паміж сабой бронзавымі інфармацыйнымі сеткамі.

Эмблема апраўлена аблямоўкай, у верхняй частцы якой знаходзіцца беларускі арнамент, у ніжняй частцы размешчаны надпіс ”МІНІСТЭРСТВА ЖЫЛЛЁВА-КАМУНАЛЬНАЙ ГАСПАДАРКІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ“ сінімі літарамі ў адзін радок. Аблямоўку вянчае выява Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь.

ЗАЦВЕРДЖАНА

Указ Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь
18.12.2001 № 757
(у рэдакцыі Указа Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь
25.08.2026 № 292 )

ВЫЯВА
эмблемы Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі



ЗАЦВЕРДЖАНА

Указ Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь
18.12.2001 № 757
(у рэдакцыі Указа Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь
25.08.2026 № 292 )

ПАЛАЖЭННЕ
аб флагу Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі

1. Флаг Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі (далей – флаг) з'яўляецца яго афіцыйным геральдычным сімвалам.

2. Флаг можа размяшчацца на будынку Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі, у службовых кабінетах Міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі, яго намеснікаў, кіраўнікоў структурных падраздзяленняў Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі і іншых месцах, якія вызначаюцца Міністрам жыллёва-камунальнай гаспадаркі.

3. Выява флага можа выкарыстоўвацца на друкаванай, рэкламнай, сувенірнай і іншай прадукцыі, якая выпрабляецца для патрэб Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі, а таксама ў іншых выпадках, якія не супярэчаць заканадаўству.

4. Пры адначасовым размяшчэнні Дзяржаўнага флага Рэспублікі Беларусь і флага іх размяшчэнне вызначаецца ў адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь ад 5 ліпеня 2004 г. № 301-З "О государственных символах Республики Беларусь".

5. Флаг можа выкарыстоўвацца падчас дзяржаўных свят і святочных дзён, урачыстых мерапрыемстваў, якія праводзяцца дзяржаўнымі органамі і іншымі арганізацыямі, а таксама пры правядзенні культурных і спартыўных мерапрыемстваў.

ЗАЦВЕРДЖАНА

Указ Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь
18.12.2001 № 757
(у рэдакцыі Указа Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь
25.08.2026 № 292 )

АПІСАННЕ
флага Міністэрства жыллёва-
камунальнай гаспадаркі

Флаг Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі ўяўляе сабой прамавугольнае палотнішча сіняга колеру з суадносінамі бакоў 1:2.

У цэнтры вонкавага і адваротнага бакоў палотнішча размешчана выява эмблемы Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі.

ЗАЦВЕРДЖАНА
Указ Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь
18.12.2001 № 757
(у рэдакцыі Указа Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь
25.08.2026 № 292 )

ВЫЯВА
флага Міністэрства жыллёва-
камунальнай гаспадаркі



ЗАЦВЕРДЖАНА
Указ Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь
18.12.2001 № 757
(у рэдакцыі Указа Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь
25.08.2026 № 292 )

ПАЛАЖЭННЕ
аб нагрудным знаку Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі ”Ганаровы работнік жыллёва-камунальнай гаспадаркі“

1. Нагрудным знакам Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі ”Ганаровы работнік жыллёва-камунальнай гаспадаркі“ (далей – нагрудны знак) узнагароджваюцца:

работнікі Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі і арганізацый, што ўваходзяць у яго сістэму, якія працавалі ў сістэме Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі не менш за 10 гадоў, за ўзорнае выкананне працоўных абавязкаў, паспяховае выкананне задач, якія стаяць перад жыллёва-камунальнай гаспадаркай Рэспублікі Беларусь;

іншыя асобы, якія ўнеслі ўклад у развіццё жыллёва-камунальнай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь.

2. Парадак прадстаўлення да ўзнагароджання нагрудным знакам і форма пасведчання да яго вызначаюцца Міністрам жыллёва-камунальнай гаспадаркі.

Узнагароджанне нагрудным знакам ажыццяўляецца згодна з загадам Міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі.

3. Нагрудны знак і пасведчанне да яго ўручаюцца ва ўрачыстай абстаноўцы Міністрам жыллёва-камунальнай гаспадаркі або па яго даручэнні адным з яго намеснікаў.

4. Асобы, узнагароджаныя нагрудным знакам, якія ўчынілі наўмыснае злачынства або дапусцілі грубыя дысцыплінарныя ўчынкі, загадам Міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі могуць быць пазбаўлены нагруднага знака.

5. Нагрудны знак носіцца на правым баку грудзей пасля ордэнаў і медалёў, а пры іх адсутнасці – на іх месцы.

6. Паўторнае ўзнагароджанне нагрудным знакам не ажыццяўляецца. Пры страце нагруднага знака дублікат не выдаецца.

ЗАЦВЕРДЖАНА

Указ Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь
18.12.2001 № 757
(у рэдакцыі Указа Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь
25.08.2026 № 292 )

АПІСАННЕ

нагруднага знака Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі ”Ганаровы работнік жыллёва-камунальнай гаспадаркі“

Нагрудны знак Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі ”Ганаровы работнік жыллёва-камунальнай гаспадаркі“ (далей – нагрудны знак) уяўляе сабой авал памерам 30х32 мм, на якім размешчаны лагатып Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Лагатып апраўляе вянок з лаўровых галін, над якім размешчаны надпіс ”ГАНАРОВЫ РАБОТНІК“, у ніжняй частцы вянка – надпіс ”ЖЫЛЛЁВА-КАМУНАЛЬНАЙ ГАСПАДАРКІ“.

Нагрудны знак з дапамогай вушка і кольца злучаецца з прамавугольнай калодкай памерам 12х24 мм, на якой размешчана выява лаўровай галіны.

Нагрудны знак і калодка вырабляюцца з металу залацістага колеру. Поле нагруднага знака пакрыта ювелірнай эмаллю белага колеру, лагатып і калодка – ювелірнай эмаллю чырвонага колеру, палі надпісаў прыцемнены.

Адваротны бок нагруднага знака мае гладкую паверхню, на якой рэльефна выкананы надпіс ”Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь“ і знак ”№“. Парадкавы нумар нагруднага знака гравіруецца.

ЗАЦВЕРДЖАНА
Указ Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь
18.12.2001 № 757
(у рэдакцыі Указа Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь
25.08.2026 № 292 )

ВЫЯВА
нагруднага знака Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі ”Ганаровы работнік жыллёва-камунальнай гаспадаркі“




“.